ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 22 (779) ● Пятніца, 12 чэрвеня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

## НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

У нядзелю працоўныя нашай краіны будуць выбіраць вышэйшы орган дзяржаўнай улады — Вярхоўны Савет СССР. Гэта з'яўляецца не толькі канстытуцыйным правам, але і высокім грамадзянскім абавязкам кожнага савецкага чалавека.

У працэсе падрыхтоўкі да гэтага знамянальнага дня ўчастковая выбарчая камісія разам з аргкамітэтам універсітэта правяла вялікую работу. Своечасова былі складзены спісы выбаршчыкаў, і цяпер заканчваецца іх удакладненне, высвятляецца, ці ўсе грамадзяне ўлічаны, ці не прапушчан хто, ці не закралася памылка ў звесткі аб выбаршчыках.

У агітпункце рэгулярна працуе сакратар і дзяжураць члены участковай выбарчай камісіі і агітатары. У любы час грамадзяне могуць праверыць свае прозвішчы і адрасы, атрымаць даведку па любому пытанню аб выбарах.

Агітпункт мае вялікі выбар палітычнай літаратуры, свежыя газеты і часопісы, ёсць план арганізоўваемых лекцый і дэманстрацыі кінафільмаў.

Выбарчая камісія прыступіла да падрыхтоўкі памяшкання, дзе будуць праводзіцца выбары. Паміж членамі ўчастковай выбарчай камісіі размеркаваны абавязкі на дзень выбараў, вызначана, хто будзе выдаваць бюлетэні, хто будзе прымаць грамадзян, якія будуць прыходзіць для ўдзелу ў галасаванні, і г. д. Складзен план культурных мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца на выбарчым участку ў дзень выбараў.

Участковая выбарчая камісія гатова да таго, каб своечасова і правільна правесці падлік галасоў, у адпаведнасці з выбарчым законам скласці пратакол аб выніках галасавання, аператыўна перадаваць паведамленні аб ходзе і канчатковых выніках выбараў.

**А. САРЖЭЎСКІ,**
старшыня ўчастковай выбарчай камісіі.

## ВЫПРАБАВАННІ ПАЧАЛІСЯ

У мінулую сераду пачаліся першыя экзамены у абітурыентаў-завочнікаў. Паступаючыя на аддзяленні журналістыкі, біялагічнае, гістарычнае, юрыдычнае, філалагічнае пісалі сачыненне па рускай мове і літаратуры. Абітурыенты матэматычнага аддзялення здавалі вусны экзамен па матэматыцы.

1.800 заяў атрымала прыёмная камісія ад жадаючых вучыцца на завочным факультэце. З іх на аддзяленне журналістыкі было пададзена 114 заяў, на біялагічнае— 219, гістарычнае — 367, юрыдычнае—455, філалагічнае—376, матэматычнае — 60, геаграфічнае — 150.

Сярод абітурыентаў многа работнікаў савецкіх і дзяржаўных устаноў, рабочых, працаўнікоў калгасаў і саўгасаў нашай рэспублікі.

Усяго на завочны факультэт будзе прынята 750 студэнтаў.

**І. СЁМІНА.**

## ГОСЦІ З БАЛГАРЫІ

Наш універсітэт наведала дэлегацыя Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы, узначальваемая членам ЦК БКП, пісьменнікам Слаўча Васевым. У складзе дэлегацыі — сакратар Ловечскага акруговага камітэта балгара-савецкай дружбы Лако Драганаў, памочнік старшыні Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы Дзімітр Данчаў, сакратар камітэта балгара-савецкай дружбы Кіркоўскага раёна Сафія Станка Атанасава.

Дэлегацыя была прынята рэктарам універсітэта акадэмікам А. Н. Сеўчанкам. У гутарцы прынялі ўдзел актывісты аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы універсітэта.

Слаўча Васев, выступаючы па беларускаму тэлебачанню, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб знаходжанні у Беларусі. Ён сказаў: «Наша дэлегацыя Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы прыбыла у Савецкі Саюз у сувязі са святкаваннем Дня славянскай пісьменнасці і балгарскай культуры, Дня Кірылы і Мяфодзія. Нас усюды сустракалі з выключнай сардэчнай цеплынёй...

У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна мы сустрэлі гасцюўшых там двух прафесараў нашага Сафійскага універсітэта. Рэктар БДУ Антон Нікіфаравіч Сеўчанка расказаў аб шырокай навуковай і вучэбнай рабоце, якая праводзіцца ва універсітэце. Мы з задавальненнем даведаліся аб мностве мерапрыемстваў універсітэцкага аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы, праведзеных сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Многа піша аб нашай краіне і культуры і газета універсітэта....»

У час знаходжання балгарскіх гасцей ва універсітэце ім былі уручаны сувеніры на памяць аб беларускай сталіцы.

## АБАРОНА ПРАЙШЛА ПАСПЯХОВА

Днямі на геаграфічным факультэце праходзіла абарона дыпломных работ студэнтаў дзённага аддзялення. Усе дванаццаць работ ацэнены на добра і выдатна. Яны заснаваны на шматгадовых даследаваннях і прадстаўляюць практычную гаспадарчую каштоўнасць.

Напрыклад, дыпламант А. Рачэўскі працаваў над тэмай «Асаблівасці механічнага складу літаральных фацый азёр Браслаўскай групы». Грануламетрыя сучасных азёрных асадкаў у Беларусі амаль не даследавана, і таму распрацоўка гэтай тэмы з'яўляецца асабліва важнай, актуальнай і цікавай. Тым больш, што аўтар змог пацвердзіць значную важнасць літаральнай зоны у азёрным комплексе і у гаспадарчым значэнні. Работа напісана у асноўным на матэрыялах лабараторыі азёразнаўства геаграфічнага факультэта, і на тых даных, якія сабраў А. Рачэўскі у час экспедыцый і эксперыментальных работ. Для напісання дыпломнай ён выкарыстаў таксама шматлікія фондавыя матэрыялы.



Выдатную ацэнку дзяржаўнай камісіі атрымала і работа выпускніка У. Радзюка «Ледніковыя азёрныя катлавіны, іх паходжанне і марфалогія (на прыкладзе Ушацкага азёрнага басейна)». Будова ледніковых азёрных катлавін, іх генезіс, марфалогія выклікаюць вялікую практычную цікавасць. Даныя па азёрных катлавінах дазваляюць больш рацыянальна выкарыстоўваць азёрныя вадаёмы у народнай гаспадарцы. Змяненне азёрнасці у сучасны перыяд (па картаграфічных матэрыялах) для Ушацкай азёрнай групы вызначана ўпершыню.

**Т. ДЗЕРАХ.**

**На здымку:** члены дзяржаўнай камісіі дацэнт, загадчык кафедры агульнай геалогіі Д. М. Карулін, прафесар М. У. Касцюковіч (старшыня), дацэнт В. Ф. Якушка, прафесар А. Г. Мядзведзеў, загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі В. Я. Крышчановіч і сакратар С. Ф. Тумішская абмяркоўваюць адзнакі дыпломных работ.

Фота **Д. Чаховіча.**

*Апошні традыцыйны школьны званок для рабят з ДРВ прагучаў на радзіме, а цяпер — першы экзамен у вну. Год — тэрмін невялікі, але за гэты час 148 юнакоў і дзяўчат, якія вучацца на падрыхтоўчым факультэце універсітэта, паспяхова здалі залікі па курсу Савецкі Саюз, чарчэнню. Паспяхова вытрымалі першы нялёгкі для іх пісьмовы экзамен па рускай мове. Большасць сачыненняў ацэнена на добра і выдатна. Вышэйшыя адзнакі атрымалі Нго Суан Дык, Нгуен Тхі Да, Нго Мінь Цьяу, Чан Ань Мінь, Хо Хак Інг, Чыонг Ан Куок, Чан Тхі Там, Нгуен Дык Цінь, Нгуен Дзінь Зунг, Ву Тхі Бік і іншыя. Наперадзе у в'етнамскіх студэнтаў не менш складаныя экзамены па матэматыцы, хіміі, фізіцы. Але можна з упэўненасцю сказаць, што яны будуць вытрыманы паспяхова.*

*Пасля заканчэння вучобы студэнты падрыхтоўчага факультэта раз'едуцца у многія вну нашай краіны. Яны будуць з удзячнасцю успамінаць тых, хто дапамагаў ім у авалоданні ведамі.*

*М. НЕЧЫПАРЭНКА, супрацоўнік падрыхтоўчага факультэта. Фота аўтара.*







# СПРАВАЗДАЧА ЗА ПЯЦЬ ГОД

*Дзяржаўныя камісіі падвялі першыя вынікі. Пераважная большасць выпускнікоў рыхтуецца уступіць у самастойнае жыццё з багатым запасам ведаў і добрай практычнай падрыхтоўкай. Такім спецыялістам будуць рады і ў школе, і на прадпрыемстве, і ў навуковай установе.*

*НА ЗДЫМКУ: дзяржаўны экзамен здаюць выпускнікі хімічнага факультэта. Перад камісіяй Л. Ламікіна.*

Фота *Л. Буцьянавай.*

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Наш карэспандэнт звярнуўся да старшыні вытворчай практыкі У. Д. Мухаева з просьбай расказаць аб тых зменах, якія адбыліся ва універсітэце ў арганізацыі вытворчай практыкі, і аб яе сувязі з вытворчасцю. Вось што ён паведаміў:

— За апошнія гады ў Беларусі асабліва бурнымі тэмпамі развіваюцца такія важныя галіны, як энергетыка, нафтавая, хімічная прамысловасць, прыборабудаванне, электроніка. Узнікненне новых галін вытворчасці, увядзенне ў эксплуатацыю новых прадпрыемстваў, забяспечаных сучасным абсталяваннем, патрабавалі папаўнення іх спецыяльнымі кадрамі. За апошнія тры гады наш універсітэт накіраваў на гэтыя прадпрыемствы сваіх выпускнікоў па спецыяльнасцях: фізікаў — 236 чалавек, радыёфізікаў — 180, хімікаў — 81, матэматыкаў-вылічальнікаў — 153.

Само жыццё цяпер патрабуе, каб любы выпускнік-фізік, хімік, матэматык валодаў не толькі добрымі тэарэтычнымі, спецыяльнымі і эканамічнымі ведамі, але і добра ведаў практыку справы, мог быць добрым арганізатарам вытворчасці, працы і масава-палітычнай работы, выхавацелем кіруемага ім калектыву. Што робіцца ва універсітэце, каб павысіць якасць практычнай падрыхтоўкі студэнтаў?

Звернемся да вучэбных планаў. За апошнія 20 год вучэбныя планы універсітэта карэкціраваліся тры разы (1949, 1953, 1964, 1967 гг.). У выніку гэтага ў вучэбных планах апошніх год рэзка павялічана працягласць вытворчай практыкі. Так, на фізічным, хімічным, матэматычным факультэтах на практыку адведзена 26—28 тыдняў і на дыпломныя работы — 19 тыдняў, што складае 32 працэнты часу, які адводзіцца на тэарэтычнае навучанне студэнта за ўвесь перыяд яго навучання.

Для больш паспяховага праходжання вытворчай практыкі за універсітэтам замацаваны на 5 год перадавыя прадпрыемствы, установы і арганізацыі рэспублікі ў якасці пастаянных баз практыкі. На 1971—75 гг. універсітэт мае наступную колькасць баз: факультэт журналістыкі — 74 рэдакцыі і студыі на 388 месц, гістарычны — 11 музеяў і архіваў на 175 месц, юрыдычны — 54 базы на 988 месц, біялагічны — 19 баз на 462 месцы, матэматычны — 9 баз на 122 месцы, хімічны — 24 базы на 242 месцы, фізічны — 14 баз на 377 месц і г. д.

У гэтым навучальным годзе праходзяць практыку 6.129 студэнтаў дзённага, вячэрняга і завочнага навучання.

Рэктарат, саветы і грамадскія арганізацыі універсітэта праводзяць вялікую работу па павышэнню тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню вучэбнай і вытворчай практыкі, набліжэнню яе да сучасных патрабаванняў навукі і практычнай дзейнасці. Напрыклад, рэгулярна распрацоўваюцца праграмы практыкі з улікам дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі і характару прадпрыемства, установы, устанаўліваюцца больш цесныя кантакты універсітэта з базамі практыкі, практыкуецца правядзенне сумесных нарад кіраўніцтва базавых прадпрыемстваў і прафесарска-выкладчыцкага саставу кафедр, факультэтаў і г. д.

Тым не менш хуткае развіццё навукі, узрастаючая дыферэнцыяцыя студэнтаў па спецыяльнасцях і спецыялізацыі патрабуе павышэння якасці правядзення практыкі.

На адбыўшымся нядаўна савеце універсітэта абмеркаваны даклады дэканаў факультэтаў аб ходзе падрыхтоўкі да правядзення вучэбнай і вытворчай практыкі ў гэтым годзе. Савет прыняў пастанову, у якой, у прыватнасці, указваецца:

саветам факультэтаў, кафедрам універсітэта распрацаваць да 20 чэрвеня г. г. канкрэтныя планы мерапрыемстваў, накіраваныя на карэннае паляпшэнне зместу і якасці ўсіх відаў практыкі студэнтаў;

перапрацаваць да 1 верасня 1970 года праграмы практыкі з улікам дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі і спецыфікі данага прадпрыемства, установы або арганізацыі.

увязваць тэмы дыпломных работ з профілем работы выпускнікоў. Практыкаваць выезды дзяржаўных экзаменацыйных камісій на абарону дыпломных работ непасрэдна на тыя прадпрыемствы, дзе студэнт праходзіў практыку і дзе ён будзе працаваць пасля заканчэння універсітэта;

устанавіць больш цесную сувязь з прадпрыемствамі, вывучаць вопыт іх работы, эканоміку і перспектывы развіцця.

не дапускаць скарачэння тэрмінаў практыкі, спазненняў студэнтаў або датэрміновага заканчэння практыкі. Забараніць накіраванне студэнтаў у перыяд практыкі ў будаўнічыя і цалінныя атрады;

кафедрам грамадскіх навук прымаць удзел у арганізацыі палітыка-выхаваўчай работы студэнтаў у перыяд практыкі на прадпрыемствах, ва установах. Усім студэнтам у час практыкі выступаць перад рабочымі, калгаснікамі з дакладамі, гутаркамі па пытаннях бягучай палітыкі, па эканамічных або філасофскіх праблемах, праводзіць культурна-масавую работу ў калектыве, удзельнічаць у выпуску насценных газет.

Рэктарат, прафесарска-выкладчыцкі састаў, грамадскія арганізацыі універсітэта надаюць вялікае значэнне арганізацыі і правядзенню практычнага навучання студэнтаў, і лічаць гэту задачу адным з абавязацельстваў у гонар знамянальнай даты—50-годдзя універсітэта.

# САПРАЎДНЫ ЭКЗАМЕН

Залік здаваць лягчэй. Пад словам «залічана» можна разумець тры адзнакі: здавальняюча, добра і выдатна. А на экзамене ідзе ўпартае змаганне за кожны бал.

Сапраўднай праверкай ведаў з'явіўся для філолагаў другога курса беларускага аддзялення экзамен па курсу сучаснай беларускай мовы.

Студэнты першай групы паказалі, што да роднай мовы — свайго асноўнага прадмета — яны адносяцца з павагай і любоўю. Паспяховы зачын зрабілі староста групы Вольга Александровіч і Наташа Асташка. Побач з іх прозвішчамі ў экзаменацыйнай ведамасці паявіліся выдатныя адзнакі.

Вось адказваць пачала Святлана Дук. Не спяшаючыся, расказвае яна аб утварэнні дзеясловаў незалежнага трывання, прыводзіць прыклады. Дзяўчына гаворыць канкрэтна, правільна, але разам з тым і асцярожна, нібы думае на хаду. Выкладчыку і асістэнту давялося ставіць дадатковыя пытанні. У цэлым адказ добры, адпаведная і адзнака.

Апрача пытанняў, якія стаяць у білеце, кожнаму даецца нямала дадатковых. Нормы літаратурнага вымаўлення, адхіленні ад іх, усебаковая характарыстыка і разбор слова — усё гэта патрабуе ведаў.

Добра падрыхтавалася да экзаменаў Ніна Івашкевіч. На білет адказвае ўпэўнена, дакладна. Да пяцёркі ёй не хапіла аднаго бала: спатыкнулася на дадатковых пытаннях.

Даючы ацэнку ведаў на экзамене, выкладчык улічвае і практычныя заняткі. Аб ведах кожнага студэнта ў яго ў нейкай меры ўжо склалася ўяўленне па тым, як напісан дыктант, як студэнт рыхтаваўся да семінараў. Шмат папрацавала перад экзаменам Валянціна Лазарчык. Семінарскія заняткі яна не ўсе наведвала, не вы[illegible]дзялялася і бліскучымі адказамі. Таму і зразумела, што пытаюць яе цяпер як след. Разважлівасцю, логікай і ўпэўненасцю яна пераконвае экзаменатараў, што заслугоўвае добрай адзнакі. А вось Анатолю Лашуку не ўдалося рэабілітаваць сябе. На працягу года да семінарскіх адносіўся абыякава. Зараз, хоць і прыкметна яго стараннe, усё ж Анатоль не змог узняцца вышэй здавальняюча.

Парадавалі сваімі адказамі Аня Нямковіч, Тэрэза Нядзвецкая, Таццяна Маслава і Наташа Лайша. Дзяўчаты сістэматычна займаліся на працягу ўсяго навучальнага года. Таму і адчуваецца, што экзамен для іх толькі прыемная размова з выкладчыкам. Усё ім зразумела, усё лёгка і проста.

Хто з хваляваннем, хто са спакойнай упэўненасцю падыходзіць да стала, пачынае жыва і бойка гаварыць. Добра здае экзамен першая група.

**Л. ПЯТРОЎ.**



**На здымку:** экзамен па беларускай мове ў студэнтаў трэцяга курса філалагічнага факультэта прымае **М. Дз. Міхей.**

# КАРЫСНАЯ ДЛЯ ЎСІХ

Сёлета, як і ў мінулыя гады, педагагічную практыку студэнты хімічнага факультэта праходзілі ў школах г. Мінска. На першым этапе — пасіўнай практыцы — яны наведвалі ўрокі вопытных выкладчыкаў, знаёміліся з методыкай выкладання, вучэбнымі планамі. У час актыўнай практыкі ўжо самі спрабавалі свае сілы. Яны правялі па 10 урокаў, першыя 2—3 з якіх былі пробнымі і ў залік не ўваходзілі. Такія ўрокі былі самыя розныя па тыпу: з тлумачэннем новага матэрыялу, кантрольныя работы, урокі з уключэннем вучнёўскага эксперыменту. Прымаліся таксама і залікі.

Разнастайнай была і форма выкладання новага матэрыялу: лекцыя, [illegible]асказ, г та ка.

Да заняткаў з вучнямі студэнты-хімікі рыхтаваліся сур'ёзна. Яны знаёміліся з матэрыяламі падручніка, вывучалі метадычную і дадатковую літаратуру, знаёмілі вучняў з навейшымі дасягненнямі ў галіне хіміі. Як правіла, планы кожнага урока практыкантаў праглядаліся метадыстам.

Пры правядзенні урокаў студэнты паказалі добрую тэарэтычную падрыхтоўку. Новы матэрыял яны імкнуліся паднесці вучням цікава і даступна, вялікую ўвагу ўдзялялі пытанням тэорыі, умела прымянялі пры гэтым наглядныя дапаможнікі, праводзілі доследы. Многія неабходныя дапаможнікі студэнты рыхтавалі самі.

Кожны праведзены урок абмяркоўваўся ўсёй групай, дзе практыканты і метадыст выказвалі свае заўвагі і рэкамендацыі.

Многа ўвагі ўдзялялі студэнты дадатковым заняткам з адстаючымі вучнямі. Праводзілі таксама і факультатыўныя урокі па самых разнастайных пытаннях хіміі. Яны актыўна рыхтавалі хімічныя вечары, канферэнцыі, прымалі ўдзел у рабоце гурткоў, дапамагалі афармляць хімічныя кабінеты, стэнды, праводзілі віктарыны, гутаркі, алімпіяды.

У школах Мінска практыканты праводзілі і выхаваўчую работу. Яны прысутнічалі на класных і камсамольскіх сходах, арганізоўвалі гутаркі, прысвечаныя ленінскаму юбілею, прымалі ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія цікавілі вучняў: наладжвалі тэматычныя вечары, культпаходы, экскурсіі, спартыўныя сустрэчы, рыхтавалі нумары мастацкай самадзейнасці.

Акрамя таго, праходзячы педагагічную практыку, студэнты знаёміліся з каляндарнымі планамі па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, афармлялі класную дакументацыю, гутарылі з бацькамі вучняў, прысутнічалі на секцыях класных кіраўнікоў і на педсаветах.

Практыкай студэнты засталіся задаволены і лічаць, што яна карысная для ўсіх, а не толькі для тых, хто ў будучым стане педагогам.

**Т. АДАМОВІЧ,**
**в. а. дацэнта кафедры неарганічнай хіміі.**

